«За вольную ды незалежную Беларусь!»

№3

# Гоман

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

красавік— травень 1991 г.

кошт 30 кап.

Цікавыя людзі мы — беларусы!

Трэба прызнацца, што якое б ліха навокал нас і з намі не рабілася, якіх бы мы не перажывалі нягод і крыўд — мы гэтага як бы не бачым, а калі і бачым, то ліха церпім ды чакаем, што нехта прыйдзе і гэтае наша ліха пабярэ з сабою.

І праўда, вечна хто-небудзь і якнебудзь, а прыходзіў і намі апекаваўся, хоць нашага ліха і не забіраў.

Быў маскоўскі цар, былі ў нас пасланыя ім усялякія чыны: земскі, вураднік, стражнік. Усе гэтыя чыны намі «апекаваліся», а мы шчыра служылі ім, як нявольнікі, ды, уздыхаючы і заціскаючы кулакі, стараліся сябе ўгаварыць, што так і трэба, каб хтось панаваў, а часта казалі, што гэта так бог даў. А самі ж мы і пальцам не кіўнулі, каб гэтым сваім апекунам паказаць іх належнае мейсца.

Але рэвалюцыя зьмяла ў сваім ходзе цара, панясьліся ў сьвет новыя воклікі будаваньня новага незалежнага жыцьця усім народам. А мы як бы нішто і ні ў чым. Пасьля царскіх чыноў прыйшлі бальшавіцкія чыны не горш сваіх папярэднікаў, прыйшлі і павялі сваю гаспадарку ў нас, а мы глядзелі і чакалі, што нехта прыйдзе ды бальшавікоў прагоніць...

*Янка Купала*
*«Больш самачыннасьці»*
*«Беларусь»,№2*
*22 кастрычніка 1919г.*

...Сацыяльная рэвалюцыя, што разгарэлася крывавым пажарам на ўсходзе Еўропы — у Расіі — і цяпер яшчэ палае ўсёпаядаючым полымем, стараецца ў сваім пабедным паходзе ніштожыць усялякія нацыянальныя перагародкі і злучыць пад чырвоным знаменем усе народы ўсяго сьвету.

Насколькі ёй гэта ўдаецца, пакажа будучыня, але пакуль што ўсе дзяржавы, апрача, разумеецца, Велікарусі, усімі сіламі стараюцца адхрысьціцца ад гэтага раю. Нацыянальная рэвалюцыя, паставіўшая сабе мэтай вызваленьне ўсіх нацый, быўшых у паднявольлі ў дужэйшых дзяржаваў, ідзе другімі шляхамі да вызваленьня чалавека зь вечных путаў няволі. Яна змагаецца за тое, каб кожны народ пастанаўляў сам аб сваёй долі і быў гаспадаром свайго краю, свайго багацьця. Нацыянальная рэвалюцыя не страміцца к аднаму богу на зямлі і не зьбівае у адну кучу ўсіх народаў пад адзін сьцяг.

*Янка Купала*
*«Справа незалежнасьці Беларусі за мінулы год»*
*«Беларусь» №8 (64)*
*14 студзеня 1920г.*

## У нумары:

✦Наша Кроніка — 2-я старонка.
✦Працяг дыскусіі: «Заметки стороннего наблюдателя...» — 3 -я стар.
✦Гісторыя бабруйскіх вуліц—4-я стар.
✦«Пажар 1904 году» — 5-я стар.
✦SOS:«Бабруйская крэпасьць ізноў у аблозе!» — 5 стар.
✦Матчын дар:«Кірыліца ці лацінка?» —6-я стар.
✦Хавэрым: «Имена, вставшие из небытия» — 7-я стар.
✦Крыху сьмеху — 8-я стар.



Бабруйскі Мікалаеўскі сабор

зруйнаваны ў 1961 годзе.

На рэштках Сабора пабудаваны водна-спартыўны комплекс. Фота-архіў «Гомана».

*4 октября 2016 года Минюст РФ внес Международный Мемориал
в реестр «некоммерческих организаций, выполняющих функцию
иностранного агента». Мы обжалуем это решение в суде.*

Библиотека Международного Мемориала